# ЭТЫКА МУДРАСЦІ ЖЫЦЦЯ (да 100-годдзя прафесара Міхаіла Яўгенавіча Цікоцкага)

*«Артылерыя – род войск,*
*Артылерысты – Богі вайны»*

«Батарэя, у бой!» – жорсткая каманда ў імгненне вырвала салдат з акопаў і… пачалася хвалюючая музыка жыцця воіна, грамадзяніна, вучонага.

Суровая нота смяротнай вайны гучала балюча і страшна, але ўсё ж цішэй за ўрачыстую і шматкаляровую сімфонію жыцця. Гарматныя залпы рвалі сэрца, білі невыносным громам па галаве, дымам засцілалі юнацкія вочы і злоснай маланкай знікалі ў небе. Снарад за снарадам. Залп за залпам. Вайна ішла не на смерць, а за жыццё.

У віхуры бою іншы раз наступаў момант, калі здавалася, што сілы ў маладых салдат не ставала. Тады ў грукат гармат уключалася нейкая звышмагутная чалавечая моц. І снарад нібыта ўзлятаў у неба прама з іх рук, а ствол гарматы, як вулкан агню, грозна трубіў ваяўнічы кліч перамогі. На дапамогу богу вайны, маладому артылерысту прыйшоў сам звышмагутны Тварэц. Ён быў на пазіцыі разам з салдатам, каб захаваць яго жыццё і жыцці мільёнаў людзей, якія выступілі супраць пякельнага ваеннага пажару.

Салдат Міхаіл Цікоцкі, артылерыст, змагаўся за прыгожае жыццё. Эстэт, творчая асоба з сям’і вядомага кампазітара, ён не хацеў быць воінам і нават за гарматным лафетам імкнуўся разгледзець сваю будучыню. Ён ваяваў за перамогу, за вясновы квяцісты ранак, гарэзлівых дзяўчат-прыгажунь, за нас і нашых дзяцей, цудоўных анёлаў. У яго душы гучала бясконца захапляльная музыка шчаслівай будучыні. На жорсткай вайне Міхаіл Цікоцкі ствараў светлую ахоўную сферу для сябе і для нас – для тых, хто толькі прыйшоў ці толькі збіраўся прыйсці ў гэты свет. Яна, духоўная сфера салдата Міхаіла Цікоцкага, поўнілася любоўю і надзеяй і была настолькі магутнай, што ні куля, ні снарад не трапілі ў яе абсяг.

Воін Цікоцкі дараваў нам будучыню без вайны і смерці. А такая будучыня шчаслівая і, як вядома, неўміручая. Удзячнае грамадства пажыццёва прысвоіла Міхаілу Яўгенавічу высокае ганаровае народнае званне – салдат Перамогі, галоўны герой Вялікай Айчыннай вайны, які

быў апорай непераможнай Савецкай арміі. На яго ваенную гімнасцёрку геройскім крылом двойчы ўзлятала зорка медаля «За адвагу». Такое высокае зззянне жыццёвай загартоўкі характару і баявых паводзін салдата на мяжы агню.

У пераможны час Міхаіл Цікоцкі не зачахліў і не адправіў у музей сваю жыццёвую гармату. У маладога чалавека, які вярнуўся з вайны, раскрыўся магутны творчы талент. Яго юнацкім натхненнем, духоўным боепрыпасам, захапляльным матывам стала культура, асвета і навука, самая каштоўная сфера нацыянальнага жыцця.

У гэтай цудоўнай духоўнай скарбонцы выкрышталізаваліся самыя яскравыя і каштоўныя рысы характару Міхаіла Цікоцкага. Былы герой-франтавік выдатна вучыўся на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Адзначым з павагай цікавы факт яго журналісцкай біяграфіі. Выпускнік універсітэта, «прафесійны артылерыст», які ўсю вайну быў пад аховай зямельных траншэй і акопаў, руйнаваў хлебныя нівы ўзрывамі снарадаў, працаваў на «мірным фронце» карэспандэнтам рэдакцый выданняў «Савецкі селянін» і «Калгасная праўда». На старонках рэспубліканскіх газет ён з асалодай і натхненнем ствараў непаўторныя вобразы працаўнікоў-беларусаў. Гэта асаблівая рыса шчодрага таленту і шчырай душы творчага чалавека, непазнавальна шырокі і каштоўны арсенал магчымасцей журналісцкай прафесіі.

Творчы патэнцыял журналіста Міхаіла Цікоцкага быў рэалізаваны ў навуковай працы. Ён першым абараніў кандыдацкую дысертацыю на аддзяленні журналістыкі ўніверсітэта ў 1953 годзе. З таго часу талент маладога вучонага і педагога стаў неад’емнай часткай душы і творчасці многіх пакаленняў беларускіх студэнтаў, журналістаў і пісьменнікаў.

На фронце Міхаіл Цікоцкі быў артылерыстам, а ва ўніверсітэце стаў майстрам мастацкага слова. Вобразнае, эмацыянальнае, душэўнае і пранікнёнае слова – самая моцная зброя ў арсенале таленавітага творцы, які адкрывае і акрыляе душу чалавека. Ідэі моўнага майстэрства журналістаў і пісьменнікаў адлюстраваны ў многіх навуковых працах прафесара Міхаіла Цікоцкага, які з’яўляецца мэтрам журналісцкай адукацыі, майстрам эстэтыкі публіцыстычнага слова. Ён заснаваў новы навуковы напрамак у беларускай лінгвістычнай навуцы, стварыў арыгінальны комплекс навуковай літаратуры як аснову асваення журналісцкага вопыту і публіцыстычнага майстэрства.

Прафесар Цікоцкі насіў прафесарскую мантыю як адзнаку вышэйшага навуковага, грамадскага і дзяржаўнага прызнання, але ў яго было таксама звышвысокае званне – прафесар ад Бога. Далёка не ўсе вучоныя надзяляюцца такім ганаровым тытулам. Рэктар універсітэта акадэмік Ф. М. Капуцкі, падкрэсліваючы каштоўнасць дзейнасці вучоных, часта паўтараў: «Бог на небе, а прафесар на зямлі!». Такое азначэнне, падаецца, выведзена з жыцця і прафесійнай дзейнасці прафесара Міхаіла Яўгенавіча Цікоцкага. Яго педагагічным крэда сталі захапляючая экспрэсія і неперАўзыдзеныя духоўныя адносіны са студэнцкай аудыторыяй. Эстэтыка выхавання і навучання ў яго педагогіцы зніставаны ў высокую маральную каштоўнасць, якая ўздымае будучага журналіста ў яго творчасці на вяршыню маральна-этычных адносін да людзей і грамадства і, што таксама, а можа, і найбольш важна, несупыннага і аб’ектыўнага аналізу рэчаіснасці.

Сярод усіх пакаленняў універсітэцкіх выкладчыкаў Міхаіл Яўгенавіч вылучаецца выключнай інтэлігентнасцю. Ён застрахаваны сваім інтэлектам ад супярэчнасцей і канфліктаў між людзьмі і калегамі. Гэта адна з найгалоўнейшых каштоўнасцей універсітэцкай супольнасці. Ні крыўднага слова, ні хцівасці, ні касога погляду, ні зайздрасці, ні карыслівасці, ні знявагі. Ні, ні, ні... як асабісты забаронны і абаронны ўстойлівы прынцып, як жыццёвае высакароднае правіла ўніверсітэцкіх інтэлігентных чалавечых паводзін. Заўважым, што такі каштоўны і павучальны дар вельмі рэдкі, і толькі такому прафесару, як Цікоцкі Міхаіл Яўгенавіч, ён падараваны лёсам.

Цікоцкі – прафесар, Міхаіл – воін, Яўгенавіч – грамадзянін! Шчаслівае, арганічнае спалучэнне эстэтычна мілагучных вызначэнняў, высакародных слоў-паняццяў для нашага героя і для тых, хто жыў і працаваў з такім цудоўным чалавекам.

Слава Госпаду за падарунак Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту, факультэту журналістыкі і нацыянальнай культуры за чалавека – стваральніка, які ўклаў талент і душу ў развіццё нашага супярэчлівага грамадства.

Хвала і гонар Міхаілу Яўгенавічу за маральны і духоўны прыклад мінулага, сучаснага і будучага. Пажадаем, каб эстэтыка жыццёвай мудрасці і чысціні пад крылом таленту прафесара Міхаіла Яўгенавіча Цікоцкага дазволіла  нам стаць бліжэй да Бога.

**А. Г. СЛУКА,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі